ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (/BE/GEO/19) 2103

Галоўнага рэдактара “Газеты Слонімскай” выклікаюць у міліцыю

05.04.2021 Крыніца: Служба маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"

Позву з’явіцца ў слонімскую міліцыю 7 красавіка ў 15.00 галоўнаму рэдактару “Газеты Слонімскай” Міколу Канановічу ўручыў дома пад подпіс участковы інспектар Слонімскага РАУС маёр міліцыі А. А. Гусар напярэдадні ўдзень.



У позве не сказана, у якасці каго і па якой справе спадара Кананoвіча выклікаюць у міліцыю.

Як паведаміў службе маніторынгу ГА “БАЖ” Мікола Кананoвіч, вусна ўчастковы Гусар сказаў яму, што размова будзе тычыцца камп’ютарнай тэхнікі рэдакцыі “ГС”, забранай міліцыяй раней на праверку, а таксама яго цяперашняй пасады ў “Газеце Слонімскай”. Участковы таксама папрасіў Кананoвіча захапіць з сабой працоўную кніжку альбо загад аб прызначэнні яго на пасаду галоўнага рэдактара.

Нагадаем, з 9 лістапада 2020 года “Газета Слонімскай” вымушана **прыпыніла свой выхад на паўгода (https://baj.media/be/content/gazeta-slonimskaya-prypynila-svoy-vyhad-na-paugoda)**. Здарылася гэта пасля таго, як з рэдакцыі, а таксама з кватэры выдаўца Ганны Валадашчук і яе сына, дырэктара прадпрыемства Яўгена Валадашчука была забраная ўся камп’ютарная тэхніка.

Камп’ютары толькі нядаўна вярнулі пасля праверкі ў рэдакцыю. Выдавец і дырэктар ПУП “Рэдакцыя газеты “Газета Слонімская” знаходзяцца пакуль за мяжой.

На пасаду галоўнага рэдактара “Газеты Слонімскай” Мікола Канановіч быў прызначаны 1 лютага 2020 года. Да гэтага ён больш як паўгода выконваў абавязкі галоўнага рэдактара падчас хваробы і пасля смерці заснавальніка “Газеты Слонімскай” Віктара Валадашчука.

У штаце рэдакцыі “Газеты Слонімскай” Мікола Канановіч працуе з восені 1998 года.

Карэспандэнту “Газеты Слонімскай” Язэпу Палубятку вярнулі ў міліцыі забраную раней тэхніку (https://baj.media/be/content/karespandentu-gazety-slonimskay-yazepu-palubyatku-vyarnuli-u-milicyi-zabranuyu-raney-tehniku)

Самыя важныя навіны і матэрыялы ў нашым Тэлеграм-канале — падпісвайцеся! (https://t.me/bajmedia)

Падпішыся на нашу інфармацыйную рассылку!

Кожны тыдзень атрымлівай на сваю пошту: магчымасці (гранты, вакансіі, конкурсы, стыпендыі), анонсы івэнтаў (лекцыі, дыскусіі, прэзентацыі, прэс-канферэнцыі) і карысны кантэнт.

(/be/node/33)

Найбольш чытанае

Коллеги в тюрьмах. Напишите им письмо поддержки АКТУАЛЬНЫЕ АДРЕСА (/be/content/kollegi-v-tyurmah-napishite-im-pismo-podderzhki-aktualnye-adresa)

«Шпіцыяльны погляд на Беларусь і беларусаў»: размова з аўтарам новага відэапраекту «Пол первого» (/be/analytics/shpicyyalny-poglyad-na-belarus-i-belarusau-razmova-z-autaram-novaga-videapraektu-pol)

Улады хочуць адабраць стары дамен. Мы змянілі пошту і сайт! (/be/content/ulady-hochuc-adabrac-stary-damen-my-zmyanili-poshtu-i-sayt)

Психолог: Коллективная травма белорусов скажется и на будущем поколении (/be/analytics/psiholog-kollektivnaya-travma-belorusov-skazhetsya-i-na-budushchem-pokolenii)

Сюжэты (/stories)

COVID-19 (/be/content/covid-19)

23.5 КаАП (/be/content/235-kaap)

Рэгуляванне Байнэту (/be/content/regulyavanne-baynetu-0)

Распаўсюд СМІ (/be/content/raspausyud-smi)

Аўтарскія калонкі (/blogs)



Вайна скончыцца. Калі-небудзь. У нашых фэйсбучных баталіях. Барыс Гарэцкі

пра ўражанні ад паездкі ў Кіеў (/be/content/vayna-skonchycca-kali-nebudz-u-nashyh-feysbuchnyh-bataliyah-barys-garecki-pra-urazhanni-ad)

Важнае



(/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)

Што матывуе ўдзельнічаць у “БАЖным” жыцці? (Інфаграфіка) (/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)

Спецпраекты (/analytics/27)



(/be/analytics/yuras-bushlyakou-bajnaja-persona)

Юрась Бушлякоў: “Моцна цісну руку!” (/be/analytics/yuras-bushlyakou-bajnaja-persona)



(/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)

Freedom House: Беларусь – у дзясятцы найгоршых краін па свабодзе слова (/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)



(/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

Закратаваны юбілей. Пра гонар быць сябрам і калегам Андрэя Аляксандрава (/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

*Беларуская асацыяцыя журналістаў

Copyright © 2008-2023 Беларуская асацыяцыя журналістаў

Мы не размяшчаем рэкламу.

e-mail: office@baj.media (mailto:office@baj.media)
Рэдакцыйная палітыка сайта (/be/editorial_policy)